# 2014 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - БЕЛАРУСЬ

## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.7




У 2014 годзе беларускія ўлады намагаліся нармалізаваць стасункі з ЗША і Еўропай і дасягнуць эканамічнай і палітычнай стабільнасці. Аднак напрыканцы года курс рубля знізіўся на 50%, выклікаўшы паніку на рынку і адстаўку ўрада. Прыкметаў палітычнай лібералізацыі не назіралася, хаця частка палітвязняў, у тым ліку кіраўнік Праваабарончага цэнтра “Вясна” Алесь Бяляцкі, былі вызваленыя. У 2015 годзе мусяць адбыцца прэзідэнцкія выбары, але арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС) не маюць аптымізму, што выбарчы год прынясе пазітыўныя змены для грамадзянскай супольнасці.




Тым не менш, даволі стабільны асяродак цягам года дазволіў АГС сфакусавацца больш на развіцці, чым на простым выжыванні. У 2014 годзе АГС нарошчвалі свой патэнцыял праз узмацненне сувязяў з мэтавымі супольнасцямі і ўдзел у праграмах арганізацыйнага развіцця. АГС больш актыўна сталі займацца мабілізацыяй мясцовых рэсурсаў, усё больш выкарыстоўваючы краўдфандын-гавыя тэхналогіі. АГС не мелі значных прарываў у сваіх адвакатыўных захадах, але доўгатэрміновыя кампаніі, ініцыяваныя ў папярэднія гады, далі свой плён. Найбольш заўважным прарывам 2014 года стала рэзкае павелічэнне пазнавальнасці дзейнасці АГС з боку грамадства. Нацыянальнае апытанне засведчыла, што колькасць беларусаў, якія карыстаюцца з паслуг АГС ці ўдзельнічаюць у дзейнасці АГС, павялічылася з 30,3% у 2013 годзе да 52,1% у 2014 годзе. Разам з тым узровень даверу да АГС застаўся на ранейшым узроўні і складае менш 38%.

Паводле звестак на 1 студзеня 2015 года, у краіне налічваліся 2,596 зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў, з іх 228 міжнародных, 709 рэспубліканскіх і 1,659 мясцовых; зарэгістраваныя і пастаўленыя на ўлік 40,259 арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў. У ліку зарэгістраваных таксама 33 саюзы (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў; 37 прафесійных саюзаў і 23,032 прафсаюзныя арганізацыі; 155 фондаў (14 міжнародных, 5 рэспубліканскіх і 136 мясцовых) і 44 некамерцыйныя ўстановы, якія маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю. Ад сярэдзіны 2013 года колькасць зарэгістраваных грамадскіх арганізацый і фондаў павялічылася на 2,9% і 6,9% адпаведна. Большасць з новых зарэгістраваных арганізацый маюць спартовы накірунак дзейнасці. У 2014 годзе было зарэгістравана некалькі арганізацый адвакатыўнай скіраванасці, да прыкладу, сацыяльна-асветніцкае грамадскае аб'яднанне "Разам супраць гепатыту". Шмат арганізацый працягваюць рэгістравацца за мяжой ці дзейнічаць без рэгістрацыі праз неспрыяльны прававы асяродак.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.8




Прававыя варункі для АГС заставаліся без прыкметаў паляпшэння ў 2014 годзе.

Дзейнасць незарэгістраваных арганізацый забараняецца Крымінальным кодэксам, і дзяржава працягвала выносіць папярэджанні па адпаведным артыкуле ў 2014 годзе. Нягледзячы на змены ў Законе "Аб грамадскіх аб'яднаннях", якія набылі моц у лютым 2014 года, працэдура рэгістрацыі для грамадскіх арганізацый і фондаў застаецца складанай і не абараняе ад адвольнай адмовы ў рэгістрацыі. Міністэрства юстыцыі распачало практыку публікацыі інфармацыі пра зарэгістраваныя і ліквідаваныя АГС, але па-ранейшаму адсутнічае статыстыка па адмовах у рэгістрацыі. АГС часта рэгіструюцца ў суседніх краінах, да прыкладу, у Літве і Польшчы, дзе створаныя адпаведныя цэнтры і інфармацыйныя сайты.

У 2014 годзе ўлады адмовілі ў рэгістрацыі шэрагу АГС, у тым ліку Праваабарончаму аб'яднанню ПАКТ, створанаму для спрыяння рэалізацыі ў Беларусі рашэнняў Камітэта ААН па правах чалавека, Краёваму згуртаванню літвінаў (пятая адмова ў рэгістрацыі), моладзеваму аб'яднанню "Справядлівы погляд", фонду "Стартідэя", грамадскаму аб'яднанню "Полюс", культурна-асветніцкаму аб'яднанню "Спадчына". Найбольш пашыраная прычына адмоваў – гэта прэтэнзіі да афармлення юрыдычнага адраса. Шэраг ініцыятыўных груп, якія маюць складанасці з рэгістрацыяй у форме грамадскай арганізацыі ці плануюць гаспадарчую дзейнасць, рэгіструюцца як недзяржаўныя некамерцыйныя ўстановы.

АГС сустракаюцца са значнымі абмежаваннямі ў сваёй дзейнасці. АГС могуць выкарыстоўваць замежныя сродкі толькі пасля іх рэгістрацыі ў адпаведных дзяржаўных органах; пры гэтым рашэнне можа залежыць ад таго, ці мае АГС ці донар лаяльнасць да дзяржавы. Працэдура рэгістрацыі з'яўляецца складанай і непрадказальнай, і выпадкі адмовы даволі частыя. АГС мусіць атрымліваць

ухваленне ад дзяржавы на кожны транш замежнага гранта, не зважаючы на колькасць траншаў у межах аднаго праекта. Правы на свабоду мірных сходаў і свабоду выказвання таксама абмежаваныя. На думку Спецыяльнага дакладчыка ААН па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, забарона сходаў прывяла да павелічэння адвольных затрыманняў і прэвентыўных арыштаў актывістаў грамадзянскай супольнасці ў 2014 годзе.

АГС па-ранейшаму застаюцца аб’ектам пераследавання з боку дзяржавы. У студзені 2014 года ўлады Шчучынскага раёна (Гродзенская вобласць) загадалі грамадскаму актывісту Аляксею Шчадрову зачыніць прытулак для бяздомных, спасылаючыся на парушэнне санітарных норм. У кастрычніку 2014 года супраць праваабаронцы, кіраўніцы праўлення Цэнтра прававой трансфармацыі Алены Танкачовай была ініцыяваная працэдура дэпартацыі за парушэнне правілаў дарожнага руху.

Грамадскія арганізацыі, найбольш пашыраны тып АГС, не маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю. Недзяржаўным некамерцыйным установам гэта дазволена, але падатак на прыбытак разлічваецца па такой жа стаўцы, як і для камерцыйных кампаній. Індывідуальныя і карпаратыўныя донары маюць падатковыя стымулы толькі ў выпадку фінансавання бюджэтных дзяржаўных, рэлігійных, культурных, спартовых арганізацый і дзевяці канкрэтных АГС, паймення вызначаных Падатковым кодэксам.

Механізм сацыяльнай замовы, які ў 2013 годзе быў замацаваны Законам “Аб сацыяльным абслугоўванні”, пачаў выкарыстоўвацца на практыцы, але пакуль даступны толькі для сацыяльных паслуг.

Цэнтр прававой трансфармацыі і Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый прапануюць кампетэнтную юрыдычную дапамогу АГС у Мінску і рэгіёнах, але многія АГС скардзяцца, што па-ранейшаму не хапае кваліфікаваных юрыстаў і аўдытараў.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ: 5.0




У 2014 годзе шэраг нацыянальных арганізацый і міжнародных праграм мелі за фокус арганізацыйнае развіццё АГС. Цягам года ўстанова “Новая Еўразія”, праграма SECTOR (Рэгіянальны экалагічны цэнтр для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы), Біржа арганізацыйнага развіцця падтрымалі каля 80 арганізацый, дваццаць з якіх атрымалі фінансаванне на стратэгічнае планаванне.

Між тым павялічваецца разрыў паміж вядучымі АГС і недасведчанымі невялікімі арганізацыямі. Новым ініцыятывам не стае рэсурсаў і ведання магчымасцей для нарошчвання свайго арганізацыйнага патэнцыялу. Арганізацыі таксама часта не разумеюць, навошта ім трэба выдаткоўваць час на арганізацыйнае развіццё.

Вядучыя АГС узмацнілі свае стасункі з мэтавымі супольнасцямі. Многія арганізацыі ўсведамляюць неабходнасць супрацы з насельніцтвам, але часта яны не маюць дастаткова рэсурсаў, ведаў і інструментаў, каб даследаваць патрэбы мэтавых груп і ўцягваць іх у сваю дзейнасць.

У большасці АГС сябры праўлення выконваюць і кіруючыя, і выканаўчыя функцыі. Падзел уладаў паміж кіруючым і выканаўчым органамі пашыраны перадусім у сетках, кааліцыях і асацыяцыях АГС.

Паводле даследавання “Патэнцыял салідарнасці ў беларускім трэцім сектары” (верасень 2013 года – чэрвень 2014 года), 65,7% з ліку 286 сябраў АГС (рэпрэзентуюць 150 арганізацый) адзначылі, што “працуюць” у трэцім сектары. Для 42% праца ў трэцім сектары з’яўляецца асноўным заняткам; 45,5% апытаных з’яўляюцца валанцёрамі. Невялікія і нядаўна ўзніклыя арганізацыі не маюць сталага персаналу, прафесійная праца для арганізацыі выконваецца супрацоўнікамі-валанцёрамі. Дзякуючы дапамозе пасярэдніцкіх арганізацый, АГС маюць магчымасць карыстацца кваліфікаванымі паслугамі бухгалтараў, IT-спецыялістаў, юрыстаў, кансультантаў па арганізацыйным развіцці, PR-менеджэраў.

Большасць АГС маюць неабходнае кампутарнае абсталяванне. У 2014 годзе 23 АГС атрымалі ліцэнзійныя праграмы Microsoft у межах праграмы Тэхнічнай падтрымкі. АГС усё часцей карыстаюцца магчымасцямі інтэрнет, у тым ліку сацыяльнымі медыямі і арганізацыйнымі вебсайтамі для прасоўвання сваёй дзейнасці і дасягненняў.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.4




Паводле апытання 150 экспертаў грамадзянскай супольнасці, якое ў 2014 годзе ладзіла Лабараторыя аксіяметрычных даследаванняў “Новак”, для беларускіх АГС важнасць крыніц фінансавання выглядае наступным чынам: замежная дапамога (28,8%), ахвяраванні грамадзян (25,2%), сяброўскія ўнёскі (24,4%), ахвяраванні бізнесу (14,3%), прыбытак ад аказання паслуг (5,7%) і дзяржаўнае фінансаванне (1,7%).

Многія замежныя донары заахвочваюць АГС рэалізоўваць праекты ў супрацоўніцтве з уладамі, што можа павялічыць шанцы на рэгістрацыю праектаў у Беларусі. Аднак гэта не дапамагае арганізацыям адвакатыўнай скіраванасці, з якімі чыноўнікі не схільныя наладжваць партнёрствы. Па-ранейшаму няма дакладных афіцыйных звестак па аб’ёмах замежнага фінансавання АГС, але заўважных зрухаў у 2014 годзе не назіралася.

Толькі адзінкавыя АГС маюць дзяржаўную фінансавую падтрымку, да прыкладу, у 2014 годзе бюджэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі склаў 4,2 мільёны даляраў (Дэкрэт №55).

У 2014 годзе пачалося практычнае прымяненне дзяржаўнай сацыяльнай замовы, якая дае права мясцовым органам улады фінансаваць сацыяльныя паслугі і праекты АГС. Больш за 30 кантрактаў на агульную суму 160 000 даляраў былі падпісаныя з шасцю АГС і іх рэгіянальнымі аддзяленнямі. У выніку восем тыпаў сацыяльных паслуг былі зробленыя ў 26 рэгіёнах Беларусі, у тым ліку медычныя і сацыяльныя паслугі для сталых людзей і людзей з інваліднасцю; сацыяльная і працоўная рэабілітацыя людзей з ментальнымі парушэннямі; сацыяльная і псіхалагічная дапамога ахвярам гандлю людзьмі і гвалту ў сям’і. Працэс фінансавання з’яўляецца празрыстым і выгадным для незалежных АГС, і ў той жа час працягваецца праца па ўдасканаленні працэдур сацыяльнай замовы.

Онлайн платформы мясцовага фандрайзінгу, кшталту “МаеСэнс” і “Social Weekend”, працягвалі развівацца ў 2014 годзе. Так, цягам года конкурс сацыяльных праектаў “Social Weekend” прыцягнуў каля 20 000 даляраў, каб падтрымаць грамадска значныя ідэі.

У 2014 годзе ўпершыню ў Беларусі Фонд “Ідэя” заснаваў Прэмію ў галіне карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці (КСА). Больш чым 25 сацыяльных праектаў, ініцыяваных камерцыйнымі кампаніямі, былі намінаваныя ў такіх катэгорыях, як філантропія, культура, спорт, адукацыя, здаровы лад жыцця, узаемадзеянне з мясцовай супольнасцю і экалогія. Да прыкладу, мабільны аператар Velcom атрымаў узнагароду за праект Velocity па развіцці сеткі велапарковак у Беларусі. У 2014 годзе беларускі бізнес падтрымліваў шэраг сацыяльных праектаў – да прыкладу, Samsung перадаў кампутары для патрэбаў дзяцей з інваліднасцю; сетка паліўных заправак А-100 арганізавала бясплатную арэнду ровараў для жыхароў Мінска. І тым не менш, ініцыятывы КСА па-ранейшаму абмежаваныя заканадаўчымі рамкамі, якія стрымліваюць спонсарства і адпаведна не спрыяюць фінансавай устойлівасці АГС.

Прыбытак за аказанне паслуг не з’яўляецца заўважнай крыніцай фінансавання для АГС, паколькі грамадскія арганізацыі – асноўная юрыдычная форма АГС – не маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю. Сяброўскія ўнёскі складаюць менш за 5% у бюджэтах АГС.

Сістэма фінансавага менеджменту АГС па-ранейшаму застаецца недастаткова празрыстай праз неабходнасць рэгістрацыі замежнага фінансавання. Бюджэты многіх АГС маюць незарэгістраваныя сродкі ад замежных ці мясцовых донараў. У публічных справаздачах і пры незалежных фінансавых аўдытах, якія дагэтуль з’яўляюцца рэдкасцю, пазначаюцца толькі сумы, атрыманыя легальна. У 2014 годзе Цэнтр прававой трансфармацыі і Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый запусцілі бясплатную праграму “Грамадскі аўдыт”, у межах якой дзесяць зарэгістраваных АГС прайшлі комплексную праверку.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.5




Адвакатыўныя магчымасці заставаліся абмежаванымі ў 2014 годзе. АГС па-ранейшаму не маюць права ініцыяваць заканадаўчыя прапановы і адпаведна залежаць ад волі міністэрстваў і парламентарыяў, якія вырашаюць, ці варта ўцягваць АГС у заканатворчыя дыскусіі. Грамадскія рады працягваюць служыць каналам камунікацыі паміж АГС і ўладамі па розных тэмах і на розных узроўнях, хаця эфектыўнасць радаў залежыць ад канкрэтных міністэрстваў. Улады пачалі прыцягваць АГС для экспертнай дапамогі. Да прыкладу, МГА "Разуменне" супрацоўнічае з Нацыянальнай камісіяй па правах дзіцяці, у тым ліку ў напрамку распрацоўкі заканадаўства і правядзення рэформ. Рэлігійныя арганізацыі маюць трывалыя сувязі з уладамі. Так, праваслаўная і каталіцкая цэрквы маюць штогадовыя сустрэчы з прэзідэнтам, а праваслаўныя арганізацыі працуюць па сумесных праграмах з міністэрствамі. Усе асноўныя канфесіі лабіруюць свае ініцыятывы праз Экспертную Раду па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў.

Разам тым рамкавыя ўмовы для адвакатавання пагоршыліся. У лютым 2014 года былі ўнесены змены ў правядзенне грамадскіх дыскусій па горадабудаўніцтву. Новая працэдура скасавала публічныя сустрэчы з масавым удзелам грамадзян, замяніўшы іх падачай пісьмовых прапаноў і сустрэчамі адмысловых камісій.

У студзені 2014 года Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў (BISS) распачаў 2-гадовы праект "Рэфорум", які з'яўляецца спробай Еўрапейскай Камісіі перазапусціць Еўрапейскі Дыялог для Мадэрнізацыі. Праект "Рэфорум" мае на мэце распрацаваць шаснаццаць праектаў рэформ па мадэрнізацыі краіны.

У 2014 годзе актыўных адвакатыўных спробаў з боку АГС не назіралася, але пачалі даваць свой плён кампаніі, ініцыяваныя ў папярэднія гады. Трохгадовая актыўная дзейнасць грамадскай кампаніі "Антымак" прывяла да таго, што ў студзені 2014 года быў падпісаны прэзідэнцкі Дэкрэт, скіраваны на рэгуляванне захадаў па ўвозе і распаўсюдзе насення маку, якое выкарыстоўваецца для вырабу наркотыкаў. Кампанія "НЕ жорсткаму абыходжанню з жывёламі", якая распачалася ў 2013 годзе, дамаглася, каб напрыканцы 2014 года Парламент прыняў папраўкі ў Крымінальны кодэкс па ўзмацненні адказнасці за жорсткае абыходжанне з жывёламі. Васьмігадовыя адвакатыўныя намаганні бізнес асацыяцый скончыліся тым, што ўрад пагадзіўся вярнуць права індывідуальных прадпрымальнікаў наймаць на працу да трох чалавек не з ліку сваякоў.

Праваабарончыя арганізацыі, праводзячы кампанію за скасаванне смяротнага пакарання цягам некалькі год, дамагліся зніжэння колькасці яго прыхільнікаў сярод беларусаў. Паводле апытання, праведзенага ў 2014 годзе па замове Penal Reform

International і пры падтрымцы РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт”, упершыню адсотак апанентаў смяротнага пакарання (43,3%) перавысіў яго прыхільнікаў (41,9%). У 2013 годзе размеркаванне апанентаў і прыхільнікаў смяротнага пакарання складала 44,9% і 46% адпаведна.

У 2014 годзе АГС працягвалі пашыраць сваю дзейнасць на шэраговых грамадзян. Праграма “Зялёны дазор”, якая рэалізуецца таварыствам “Зялёная сетка” ў партнёрстве з Цэнтрам экалагічных рашэнняў, Мінскім роварным таварыствам і арганізацыямі па абароне жывёлаў, мае за мэту уключыць жыхароў, моладзь і сталых людзей, у маніторынгавую дзейнасць па адсочванні выканання заканадаўства. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа ўтварыла 44 ініцыятыўныя групы па ўсёй краіне для ўдзелу ў вырашэнні мясцовых пытанняў.

АГС робяць адвакатыўныя спробы для паляпшэння асяродку для сваёй дзейнасці. Цэнтр па правах чалавека і Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый у 2014 годзе падрыхтавалі супольную справаздачу ў межах працэдуры УПА Рады па правах чалавека ААН на тэму свабоды асацыяцый у Беларусі. Справаздача была пададзеная ад імя 11 праваабарончых арганізацый, што дэманструе скаардынаваную адвакатыўную пазіцыю на міжнародным ўзроўні. У 2014 годзе МАГА “АКТ” распрацаваў і ініцыяваў абмеркаванне праекта Закона, які заклікаць ўрэгуляваць працэсы дабрачыннасці і спонсарства ў краіне.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГ: 5.3




АГС аказваюць кансультатыўныя і паслугі падтрымкі ў разнастайных галінах – адукацыя і асвета, ахова здароўя, экалогія, сацыяльная абарона, культура і адпачынак, спорт і турызм, правы чалавека і г.д. Усё больш паслуг робяцца ў рэжыме онлайн. Да прыкладу, грамадскае аб’яднанне “Беларуская асацыяцыя інвалідаў-вазочнікаў” зладзіла серыю вебінараў па пытаннях даступнасці і аховы здароўя. Грамадскае аб’яднанне “Ахова птушак Бацькаўшчыны” запусціла онлайн базу, якая дазваляе грамадзянам удзельнічаць у зборы інфармацыі на тэрыторыях, важных для захавання біяразнастайнасці. Як правіла, АГС улічваюць патрэбы і прыярытэты мэтавых супольнасцей у сваіх праграмах. АГС вызначаюць гэтыя патрэбы ў розны спосаб: апытанні, фокус групы, парцісіпаторная ацэнка, дыскусіі на публічных мерапрыемствах і агульных сходах АГС.

Усё больш людзей па-за межамі сяброўскіх базаў маюць дасяг да паслуг АГС, да прыкладу, Універсітэт залатога веку ў Гродна і бясплатныя курсы беларускай мовы “Мова Нанова”. Сталыя слухачы пенсійнага ўзросту, якія наведваюць заняткі Універсітэта залатога веку, часткова пакрываюць выдаткі на навучанне асабістымі ахвяраваннямі.

Цягам года з’явіліся некалькі заўважных аналітычных прадуктаў АГС. Навукова-даследчая ўстанова “Аналітычная група “Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі” зрабіла даследаванне па праблемах працаўладкавання людзей з інваліднасцю праз люстэрка СМІ. Асветніцкая ўстанова “Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый” прэзентавала чатыры сектарныя даследаванні з аналізам сацыяльных паслугаў, рэгіянальнага і мясцовага развіцця, сектара некамерцыйных бізнес аб’яднанняў і гендэрных пытанняў у Беларусі.

Большасць АГС не адсочваюць запыт на свае паслугі і магчымасці кліентаў іх аплочваць. Праўда, у 2014 годзе некалькі арганізацый сацыяльнай арыентаванасці зрабілі калькуляцыю сваіх паслуг для таго, каб прапанаваць іх дзяржаве для сацыяльнай замовы.

Дзяржаўныя органы разумеюць неабходнасць прыцягваць АГС да аказання сацыяльных паслуг. У 2014 годзе ўлады ўпершыню падпісалі адпаведныя кантракты з АГС у межах механізму сацыяльнай замовы. У той жа час урад мае варожае стаўленне да паслуг і мерапрыемстваў тых арганізацый, якія могуць выклікаць масавую актыўнасць. Да прыкладу, мясцовыя ўлады не дазволілі Універсітэту залатога веку зладзіць выпускную вечарыну ў памяшканні дзяржаўнай установы. Нягледзячы на папярэднюю дамову на правядзенне кірмашу ў вёсцы Лынтупы па ініцыятыве РГА “Экадом”, частка праграмы і выступоўцы былі пазней забароненыя мясцовымі чыноўнікамі.

## ІНФРАСТРУКТУРА: 5.2




Нацыянальныя і міжнародныя пасярэдніцкія арганізацыі падтрымліваюць АГС праз кансультацыі, навучанне, інфармацыйныя паслугі і малыя гранты. Такая падтрымка пераважна фінансуецца замежнымі донарамі. Пасярэдніцкія арганізацыі сканцэнтраваныя ў асноўным ў сталіцы і вялікіх гарадах. У выніку нядаўна створаныя АГС, асабліва на мясцовым узроўні, маюць абмежаваны доступ да пасярэдніцкіх арганізацый. Каля 100 вядучых сталых беларускіх АГС аказваюць паслугі падтрымкі для іншых арганізацый грамадзянскай супольнасці.

Разнастайнасць і якасць паслуг ад пасярэдніцкіх арганізацый павялічваецца. Да прыкладу, ГА “Узаемаразуменне” пачало аказваць кансультацыі па рэгістрацыі міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Пасярэдніцкія арганізацыі ўсё больш арыентуюцца на патрэбы АГС, прыцягваюць мэтавыя групы да планавання, рэалізацыі і ацэнкі сваіх паслуг. Так, установа “Новая Еўразія”, плануючы сваю праграму арганізацыйнага развіцця беларускіх АГС, зладзіла шэраг кансультацый з патэнцыйнымі кліентамі.

У Беларусі няма фондаў мясцовага развіцця, якія б мелі магчымасць мабілізоўваць мясцовыя рэсурсы і размяркоўваць іх у выглядзе грантаў. Замест гэтага, мясцовыя

фонды рэалізуюць уласныя праекты. Пэўная колькасць АГС займаецца рэгрантынгам – размеркаваннем малых грантаў з вялікіх праектаў, якія фінансуюцца замежнымі донарамі.

Асацыяцыі, сеткі, кааліцыі АГС пашыраюцца і развіваюцца, у прыватнасці, таварыства "Зялёная сетка", Белсетка антыСНІД, Асацыяцыя арганізацый для людзей з інваліднасцю, Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый, Гендэрная сетка, Сетка супраць гвалту ў сям'і і г.д. У 2014 годзе колькасць сябраў таварыства "Зялёная сетка" павялічылася на 45%. Большасць кампаній экалагічнай скіраванасці, кшталту Кампаніі па захаванні клімату, рэалізуюцца супольнымі намаганнямі некалькіх арганізацый. У той жа час у Беларусі няма адзінай сеткі, якая б рэпрэзентавала ўвесь трэці сектар.

АГС маюць доступ да навучання як па базавых пытаннях менеджменту АГС, так і па больш спецыфічных тэмах. Асветніцкая ўстанова "Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый", цэнтр эфектыўных камунікацый "Фідбэк", міжнародны кансорцыум "Еўрабеларусь", Беларуская нацыянальная моладзевая Рада, таварыства "Зялёная сетка", Офіс па правах людзей з інваліднасцю і іншыя арганізацыі аказваюць шырокі спектр паслуг па навучанні прадстаўнікоў АГС адпаведна іх патрэбам. Трэнінгі, як правіла, з'яўляюцца даступнымі геаграфічна і фінансава для АГС па ўсёй Беларусі. Біржа арганізацыйнага развіцця – платформа, дзе размяшчаецца інфармацыя па больш чым 100 кансультантам і 100 арганізацыям, якія шукаюць паслугі ў сферы арганізацыйнага развіцця, – выдала ўдвая больш ваўчараў, чым за папярэднія два гады: у 2014 годзе былі выдадзены 26 ваўчараў і ўхваленыя яшчэ дзевяць.

Заахоўваецца тэндэнцыя на ўзмацненне ўзаемадзеяння паміж АГС і дзяржаўным сектарам. У прыватнасці, сацыяльна арыентаваныя арганізацыі і АГС, якія працуюць з людзьмі з інваліднасцю (ДГА "Цэнтр дапамогі аўтычным дзецям", ГА "Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам"), шчыльна супрацоўнічаюць з дзяржавай. Паводле даследавання 2014 года, праведзенага Асамблеяй дэмакратычных няўрадавых арганізацый, 59% мясцовых арганізацый рэалізуюць праекты і асобныя віды дзейнасці супольна з мясцовымі ўладамі. У Гродзенскай вобласці АГС прымаюць удзел у распрацоўцы прапановаў для стратэгіі ўстойлівага развіцця рэгіёна.

Усе бакі паступова пачынаюць усведамляць выгады міжсектарнага партнёрства. У лютым 2014 года ў Віцебску быў праведзены "Навучальны форум" з мэтай паспрыяць міжсектарнаму супрацоўніцтву ў галіне нефармальнай адукацыі. У форуме бралі ўдзел прадстаўнікі органаў улады, кіраўнікі і супрацоўнікі адукацыйных і культурных устаноў, незалежныя эксперты і спецыялісты прыватных навучальных цэнтраў.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.8

Інфармаванне пра дзейнасць АГС павялічылася як з боку незалежных, так і дзяржаўных медыя. У 2014 годзе незалежныя медыя падавалі рэгулярныя матэрыялы пра асобныя ініцыятывы АГС, у тым ліку моўныя курсы "Мова Нанова" і "Мова ці кава", спартовы фестываль "Мова Cup", фестываль беларускай культуры "Дзень вышыванкі". У публічнай падтрымцы дадзеных ініцыятываў бралі ўдзел зоркі спорту і культуры. На старонках медыя пачалося абмеркаванне такіх праблематычных пытанняў, як сітуацыя ў інтэрнатах для інвалідаў, што раней было




закрытай тэмай для дзяржаўных СМІ. Відавочна негатыўных матэрыялаў пра АГС цягам года не фіксавалася.

Паводле сацыялагічнага апытання, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), узровень пазнавальнасці АГС з боку беларусаў – ці праз удзел у дзейнасці АГС, ці атрыманне паслуг ад АГС – павялічыўся з 30,3% у 2013 годзе да 52,1% у 2014 годзе. Такі заўважны рост можна звязаць з лепшай інфармацыйнай працай АГС, большай прысутнасцю АГС у супольнасцях і сацыяльных медыя, краўфандынгавымі механізмамі і больш эфектыўнымі адвакатыўнымі захадамі. Паводле Лабараторыі аксіяметрычных даследаванняў "Новак", цікавасць грамадскасці да сацыяльных пытанняў таксама была выкліканая сітуацыяй ва Украіне.

Апытанне НІСЭПД таксама паказвае, што разам з павелічэннем пазнавальнасці давер да АГС павялічыўся толькі на 4,9% і складае 37,7% у 2014 годзе. Блізу 28,7% рэспандэнтаў давяраюць праваабарончым арганізацыям, 42,5% - не маюць даверу. Сярод АГС давер беларусаў павялічыўся перадусім да афіцыйных прафсаюзаў (37% у 2013 годзе і 44% у 2014 годзе) і да арганізацый, якія абараняюць правы людзей з інваліднасцю (32% у 2013 годзе і 41% у 2014 годзе).

Улады па-ранейшаму захоўваюць нейтральнае стаўленне да сацыяльна арыентаваных арганізацый і насцярожанае – да праваабарончых. Паводле даследавання Лабараторыі "Новак", дзе рэспандэнтамі выступілі 150 экспертаў АГС, 39,3% чыноўнікаў успрымаюць АГС як палітычную апазіцыю; 38,7% ставяцца да АГС як нязначных арганізацый, якіх магчыма ігнараваць; 26% бачаць у АГС партнёраў і 25,3% прызнаюць АГС экспертамі. Большае разуменне і падтрымку АГС пачалі знаходзіць сярод камерцыйных кампаній.

АГС працягваюць заваёўваць онлайн прастору ў сваіх камунікацыйных мэтах. Усе найбуйнейшыя нацыянальныя вебсайты маюць раздзел "Грамадства", дзе перыядычна размяшчаюць інфармацыю пра дзейнасць АГС. Аднак толькі адзінкавыя АГС сістэмна займаюцца інфармацыйнай працай, у тым ліку стасункамі з медыя. Большасць АГС не лічаць інфармаванне грамадскасці вартым сур'ёзнай увагі, паколькі разглядаюць свае мэтавыя аўдыторыі у асноўным у якасці атрымальнікаў паслуг, а не патэнцыйных крыніц матэрыяльнай падтрымкі.

АГС па-ранейшаму дэманструюць абмежаваную празрыстаць сваёй дзейнасці, часткова праз фактар рэпрэсіўнага заканадаўства. Толькі некаторыя АГС маюць этычныя кодэксы. Разам з тым колькасць АГС, якія публікуюць публічныя справаздачы, няўхільна павялічваецца.

# АГЛЯД УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ

Сектары АГС у дваццаці дзевяці краінах, апісаныя ў *Індэксе ўстойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі,* застаюцца вельмі рознымі і ахопліваюць ўвесь спектр катэгорый устойлівасці. На адным канцы спектру знаходзіцца Эстонія, якая дасягнула найвышэйшага ўзроўня сектарнай устойлівасці ў параўнанні не толькі з краінамі, ацэненымі *Індэксам ўстойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі,* але і з усімі выданнямі *Індэкса ўстойлівасці АГС.* З насельніцтвам у 1,3 млн чалавек, болей за 30000 АГС у краіне карыстаюцца прывілеямі спрыяльнага прававога асяродку, інфраструктуры і грамадскага іміджу і актыўна працуюць у галіне адвакатавання і аказання паслугаў. На іншым канцы спектру знаходзяцца Беларусь і Туркменістан з 2600 і 106 зарэгістраванымі АГС адпаведна, якія дзейнічаюць у надта неспрыяльным прававым асяродку, з абмежаваным доступам да фінансавання і, фактычна, у прасторы, дзе немагчыма весці незалежныя адвакацыйныя дзеянні.

Падзеі ва Украіне сталі ў 2014 годзе найбольш значнымі ў рэгіёне. Масавыя пратэсты, якія пачаліся ў Кіеве ў лістападзе 2013 года ў сувязі з адмовай урада краіны ад плану інтэграцыі ў Еўразвяз, у выніку прывялі да ўцёкаў тагачаснага Прэзідэнта Віктара Януковіча і з'яўлення новага ўрада і новага Прэзідэнта. У сакавіку 2014 года Расія анексавала Крым, а ў Данбаскім рэгіёне распачаўся ваенны канфлікт, што прывяло да гуманітарнага крызісу ва Украіне і з'яўлення аднаго мільёна прымусовых перасяленцаў і 600000 асобаў, якія ўцяклі ў суседнія краіны. Цягам гэтага бурлівага перыяду ўкраінская грамадзянская супольнасць узяла на сябе адказнасць у абставінах, якія склаліся, і выканала ключавую ролю ў фармаванні прыярытэтаў новага ўрада і аказанні неабходных паслугаў людзям. У выніку агульная ўстойлівасць АГС у 2014 годзе палепшылася па такіх параметрах як арганізацыйны патэнцыял, дыверсіфікацыя крыніцаў фінансавання, фінансавы менеджмент, адвакацыйныя кампаніі, аказанне паслугаў і ўспрыняцце АГС грамадствам.

Гэтыя падзеі паўплывалі на грамадзянскую супольнасць іншых краінаў рэгіёна, дэманструючы розныя падыходы да грамадзянскай супольнасці і дэмакратыі ў гэтым рэгіёне. Латвія і Літва, напрыклад, замацавалі свой выбар на карысць свабоды і дэмакратычных каштоўнасцяў: фізічныя асобы і АГС збіралі грошы, ладзілі гуманітарную дапамогу, пратэставалі і рабілі публічныя мерапрыемствы, каб палепшыць уяўленне пра сітуацыю ва Украіне. У Казахстане анексія Расіей Крыма узмацніла апазіцыйны настрой людзей у дачыненні да плана краіны далучыцца напачатку года да прапанаванага Еўразійскага Эканамічнага Звяза. Тым не менш, кампаніі не мелі поспеху, і Казахстан падпісаў дамову, пагадзіўшыся далучыцца да Звяза ў маі.

У Расіі, з іншага боку, ўзмоцнены дзяржаўны кантроль над медыя, больш актыўнае ўжыванне нацыяналістычнай рыторыкі і працяглыя дзеянні дзяржавы па кантролі ці абмежаванні фактычна любых праяваў арганізаванай актыўнасці ў публічнай сферы стварылі асяродак, варожы для развіцця АГС, і ў выніку знізілі ў бягучым *Індэксе* агульны паказчык устойлівасці сектара. У Таджыкістане ўлады ўзмацнілі барацьбу супраць публічных сходаў з прычыны падазрэння ўплыву Захаду на мясцовую грамадскую супольнасць пасля палітычнага крызісу ва Украіне. Тым

часам, у Азербайджане дзяржаўныя медыя сцвярджалі, што АГС, якія карыстаюцца падтрымкай Захаду, працуюць як замежныя агенты, каб і надалей дэстабілізаваць сітуацыю ў Азербайджане і ва Украіне, чым справакавалі рост падазрэння да мясцовых АГС Азербайджана.

*Індэкс устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі* гэтага года яскрава сведчыць пра тое, што краіны рэгіёна рухаюцца па розных траекторыях нават па-за межамі сітуацыі ва Украіне. Усё болей і болей грамадзянская супольнасць Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі дзейнічае ў дзвюх розных рэчаіснасцях. Гэты падзел існуе як паміж краінамі, з пункту гледжання надзвычай розных прававых і працоўных асяродкаў, так і ўнутры краінаў, дзе для розных АГС існуюць розныя абмежаванні і розныя прывілеі. АГС таксама сутыкаюцца з шэрагам перашкодаў, датычных паляпшэння іх грамадскага іміджу. Разам з тым, АГС па-ранейшаму цяжка забяспечыць сваю фінансавую ўстойлівасць, але шмат з іх пачалі выдумляць нетрадыцыйныя спосабы дыверсіфікацыі крыніцаў фінансавання і звяртацца да звычайных грамадзянаў.

## АПОВЕСЦЬ ПРА ДЗВЕ ГРАМАДЗЯНСКІЯ СУПОЛЬНАСЦІ

Шэраг краінаў, у асноўным у Паўночным рэгіёне, захоўваюць спрыяльны прававы асяродак. АГС у гэтых краінах рэгіструюцца і працуюць без складанасцяў, не адчуваючы ціску з боку дзяржавы і не сутыкаючыся з залішнімі бюракратычнымі перашкодамі. АГС актыўна і адкрыта выказваюцца па палітычных пытаннях без страху пакарання. У большасці гэтых краінаў АГС і іхнія донары карыстаюцца падаткавымі ільготамі, што ўзмацняе фінансавую ўстойлівасць арганізацый.

Дзве краіны – Малдова і Косава – у 2014 годзе палепшылі прававы асяродак грамадзянскай супольнасці. У Малдове змены ў Грамадзянскім кодэксе спрасцілі працэс ліквідацыі АГС і іншых юрыдычных асобаў, а ўхваленыя папраўкі ў Падатковы кодэкс стварылі прававыя ўмовы, у якіх фізічныя і юрыдычныя асобы атрымалі магчымасць ахвяраваць 2% ад падаходнага падатку АГС са статусам грамадска карыснай арганізацыі. Апроч таго, Міністэрства юстыцыі плануе ўвесці сістэму аднаго акна для рэгістрацыі арганізацый. У Косаве ў 2014 годзе стала магчымым зарэгістраваць АГС у інтэрнэце.

Адначасова, прававы асяродак пагоршыўся ў дзесяці вельмі розных краінах, ад Балгарыі, чый паказчык застаецца ў катэгорыі “Трывалая ўстойлівасць”, да Таджыкістана, які ўжо дагэтуль месціўся ў катэгорыі “Ускладненая устойлівасць”. Тры краіны перажылі за гэты год асабліва сур’ёзныя пагаршэнні прававога асяродка для грамадзянскай супольнасці. Венгрыя працягвала рэзка губляць свае пазіцыі яшчэ ад 2009 года. Спачатку новы Грамадзянскі кодэкс, які набыў моц у сакавіку 2014 года, увёў у дзеянне шэраг праблематычных палажэнняў, сярод якіх персанальная адказнасць законных прадстаўнікоў арганізацыі за яе фінансавыя абавязацельствы. Больш за тое, АГС, асабліва тыя, што ўзаемадзейнічалі з Еўрапейскай эканамічнай зонай/Нарвежскім фондам НДА, пацярпелі ад пераследу і пагрозаў з боку ўрада, а прэм’ер-міністр зрабіў публічную заяву, якая застрашыла яшчэ шырэйшае кола грамадзянскай супольнасці. Венгрыя пакуль знаходзіцца ў катэгорыі “Трывалая устойлівасць”, але ў 2014 годзе яе паказчык за прававы асяродак стаў найніжэйшым за ўсю гісторыю *Індэкса устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі.*

У Расіі шэраг прававых зменаў зрабіў больш жорсткім дзяржаўны кантроль над дзейнасцю АГС і ўпершыню за васямнаццаць гадоў існавання *Індэксу* адкінуў краіну па прававым асяродку ў катэгорыю “Ускладненая устойлівасць”. Змены ў Закон аб некамерцыйных арганізацыях, зробленыя ў лютым, зараз даюць дадатковыя падставы для пазапланавых праверак АГС, у тым ліку і простае падазрэнне, што нейкая АГС дзейнічае як замежны агент. Акрамя таго, працэдура, па якой можна прылічыць АГС да замежных агентаў, была змененая ў чэрвені і дала Міністэрству юстыцыі поўную свабоду заносіць АГС у рэестр замежных агентаў. Акрамя таго, прыняты ў ліпені 2014 года Закон аб грамадскім кантролі дае права ажыццяўляць кантроль толькі грамадскім палатам і саветам, чым абмяжоўвае выкананне гэтай функцыі АГС. У дадатак да гэтага, дзяржава прыняла шэраг захадаў, каб павялічыць кантроль над грамадскім дыскурсам і інфармацыяй, у тым ліку крыміналізавала паўторныя вулічныя пратэсты, запатрабавала, каб блогеры з колькасцю штодзённых чытачоў болей за 3000 зарэгістраваліся ў органе па рэгуляванні дзейнасці СМІ і жорстка абмежавалі права замежнікаў валодаць расійскімі медыя.

Прававы асяродак у Азербайджане значна пагоршыўся і апусціўся з ніжняй мяжы катэгорыі “Устойлівасць развіваецца” да сярэдзіны катэгорыі “Ускладненая устойлівасць”. З канца 2013 года ў законы адносна АГС быў прыняты шэраг паправак, якія істотна абмежавалі поле дзейнасці грамадзянскай супольнасці. Апроч таго, у 2014 годзе дзяржава запусціла беспрэцэдэнтную хвалюператрусаў офісаў азербайджанскіх і замежных АГС, за якой пачалося ўмяшанне ў іх дзейнасць, замарожванне банкаўскіх рахункаў і неабгрунтаваныя адмовы ў рэгістрацыі грантаў. У выніку гэтых зменаў Азербайджан зараз мае па дадзеным параметры найніжэйшы паказчык з 2000 года.

У шэрагу краінаў Цэнтральнай Азіі прававы асяродак таксама пагоршыўся. У Казахстане, напрыклад, прынятыя ўрадам папраўкі ў новы Крымінальны кодэкс і ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях могуць істотна перашкодзіць дзейнасці АГС, таму што былі ўведзеныя такія пакаранні, як пазбаўленне волі, штрафы, прыпыненне дзейнасці альбо поўная забарона дзейнасці за разнастайныя правапарушэнні. У Таджыкістане дзяржава ініцыявала патэнцыйна абмежавальныя змены заканадаўства, якія патрабуюць ад таджыкскіх АГС, якія карыстаюцца замежным фінансаваннем, інфармаваць Міністэрства замежных спраў перад тым, як сусрэцца з дзяржаўнымі чыноўнікамі альбо правесці некаторыя віды мерапрыемстваў за замежныя сродкі, а таксама ўзмацняюць кантроль і нагляд за дзейнасцю АГС. У Кыргызстане дзяржава прапанавала шэраг законапраектаў, якія абмяжуюць свабоду асацыяцыяў: праекты законаў аб забароне прапаганды гомасексуалізму і аб класіфікацыі АГС, якія карыстаюцца замежным фінансаваннем, як замежных агентаў, а таксама папраўкі ў Закон аб некамерцыйных арганізацыях, якія забароняць дзейнасць незарэгістраваных АГС.

Прававы асяродак у Туркменістане і Узбекістане застаецца надзвычай абмежавальны. АГС у гэтых краінах цяжка зарэгістравацца і атрымаць замежнае фінансаванне, яны падлягаюць суровым пакаранням (штрафы і/альбо пазбаўленне волі) за шэраг правапарушэнняў, за тое, што яны незарэгістраваныя, што вядуць дзейнасць, не абумоўленую заканадаўствам аб АГС, за тое, што не адсправаздачыліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі. У выніку існавання абмежавальнага асяродку ў абедзвюх краінах існуе мала незалежных арганізацый. Хаця ў выданні *Індэксу ўстойлівасці АГС* гэтага года паказчыкі Туркменістана і Узбекістана не пазначаныя, у абедзвюх краінах у 2014 годзе адбыліся сціплыя паляпшэнні. У Туркменістане новы

Закон аб грамадскіх арганізацыях, прыняты ў маі 2014 года, дазваляе грамадскім арганізацыям весці прадпрымальніцкую дзейнасць; прадухіляе пазбаўленне грамадскіх арганізацый рэгістрацыі альбо прыпыненне іх дзейнасці Міністэрствам юстыцыі; дазваляе замежнікам і юрыдычным асобам быць заснавальнікамі і сябрамі грамадскіх арганізацый. Ва Узбекістане шэраг прававых, палітычных і канстытуцыйных зменаў у 2014 годзе патэнцыйна можа павялічыць памер, разнастайнасць, устойлівасць і ролю грамадзянскай супольнасці ў грамадстве Узбекістана. Асноўныя змены тычацца паляпшэння працэса рэгістрацыі АГС і прыняцця законаў аб празрыстасці ўрада, сацыяльным партнёрстве і зваротах грамадзянаў.

Рост разрыву паміж умовамі дзейнасці АГС у розных краінах спараджае падобныя тэндэнцыі і ўнутры краінаў, дзе для розных тыпаў АГС існуюць розныя абмежаванні і прывілеі. Напрыклад, адвакацыйныя АГС і сацыяльныя АГС могуць сутыкацца з球 рознымі рэаліямі, альбо стаўленне да іх у значнай ступені залежыць ад іх стасункаў з дзяржавай. У Расіі, да прыкладу, палажэнні Закона аб замежных агентах у рознай ступені ўплываюць на адвакацыйныя і праваабарончыя АГС, якія часта амаль не маюць іншай магчымасці атрымаць фінансаванне, як толькі ад замежных донараў. Як вынік, арганізацыйны патэнцыял найбольш знаных праваабарончых і адвакацыйных арганізацый у краіне ў 2014 годзе пагоршыўся, таму што яны былі вымушаны скіраваць крытычна важныя рэсурсы на прававую абарону супраць розных заканадаўчых, нарматыйных і прававых дзеянняў з боку ўладаў, што стварыла ім вялікія цяжкасці ў вядзенні штодзённай дзейнасці.

У Беларусі дзяржава па-ранейшаму ставіцца абыякава да сацыяльных АГС і негатыўна да праваабарончых і дэмакратычных арганізацый. Беларускія АГС маюць права карыстацца замежнымі фінансамі толькі пасля іх зацвярджэння групай міністэрстваў і ведамстваў, а рашэнне грунтуецца на тым, у якой ступені АГС і донар надзейныя і верныя дзяржаве. Падобная сітуацыя ў Туркменістане, дзе жорсткія абмежаванні ўрада азначаюць, што ў краіне вельмі мала незалежных АГС, а ў тых, што існуюць, абмежаваны патэнцыял. У той жа час НДА, створаныя дзяржавай (так званыя GONGO), карыстаюцца істотнай дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе фінансавання, памяшканняў пад офіс і абсталявання. Ва Узбекістане некалькі АГС пры падтрымцы дзяржавы атрымліваюць большасць фінансаў, якія размяркоўваюцца праз Грамадскі фонд падтрымкі недзяржаўных некамерцыйных арганізацый пры Парламенце. Гэтыя АГС рэгулярна ўдзельнічаюць у дзяржаўных канферэнцыях, працоўных сустрэчах і круглых сталах, дзе абмяркоўваюцца палітычныя пытанні, а разам з тым незалежныя АГС сутыкаюцца з цяжкасцямі пры правядзенні адвакацыйных дзеянняў.

## ПЕРАШКОДЫ НА ШЛЯХУ ДА ПАЛЯПШЭННЯ ГРАМАДСКАГА ІМІДЖУ

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС) ва ўсім рэгіёне адчуваюць цяжкасці ў забеспячэнні станоўчага грамадскага іміджу, а шараговы грамадзянін па-ранейшаму не мае дакладнага ўяўлення пра сферу дзейнасці і ролю грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, нават у Эстоніі, якая сярод усіх краінаў Еўразіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы мае найлепшы паказчык у сферы грамадскага іміджу і ў якой АГС у большасці выпадкаў станоўча асвятляюцца ў СМІ, а грамадскія актывісты часта ўспрымаюцца як лідэры ў фармаванні грамадскай думкі, па-ранейшаму не ясна, ці разумее шырокая грамадскасць канцэпцыю АГС. Да прыкладу, апытанне,

праведзенае Еўрабарометрам у 2013 годзе, паказала, што 26 працэнтаў рэспандэнтаў не былі ўпэўненыя ў тым, што АГС прадстаўлялі іх інтарэсы.

АГС сутыкаюцца з шэрагам перашкодаў у працэсе паляпшэння свайго грамадскага іміджу. У многіх краінах АГС маюць абмежаваны доступ да вядучых СМІ праз адсутнасць інтарэсу да іх з боку гэтых СМІ, слабых навыкаў сувязяў з грамадскасцю сярод саміх АГС, а таксама слабых журналісцкіх навыкаў. Акрамя таго, СМІ часта больш зацікаўленыя ў асвятленні скандалаў з удзелам АГС, чым у штодзённай дзейнасці і выніках працы грамадскага сектара. Напрыклад, паводле справаздачы па Польшчы, якая мае другі найвышэйшы паказчык у сферы грамадскага іміджу, асвятленне ў СМІ сфакусаванае на фінансавых скандалах з удзелам АГС і значных пратэстах або падзеях, а не на станоўчых выніках штодзённай працы АГС. У 2014 годзе ў Харватыі і Албаніі скандалы з удзелам АГС атрымалі шырокае асвятленне ў СМІ, што негатыўна паўплывала на меркаванне грамадскасці пра дадзены сектар.

Большую заклапочанасць выклікае тое, што ў 2014 годзе ўрад і дзяржаўныя ці праўрадавыя СМІ ў шэрагу краінаў наўмысна ладзілі паклёпніцкія кампаніі супраць АГС. Галоўнай тактыкай многіх кампаній такога кшталту было абвінавачанне АГС у працы ў якасці замежных агентаў, якія дзейнічаюць супраць інтарэсаў краіны – тэндэнцыя, якая ўзнікла ў Расіі некалькі гадоў таму. У 2014 годзе рыторыка расійскага ўрада рабілася ўсё болей антызаходняй. Лідэры АГС, асабліва тыя, хто ўдзельнічаў у прасоўванні правоў чалавека і палітычных правоў, апісваліся як шпіёны і агенты па прасоўванні меркавання Захаду. У Казахстане мясцовыя СМІ пачалі абвінавачваць АГС у працы ў якасці замежных агентаў, у той час як у Балгарыі АГС у некалькіх афіцыйных выданнях былі названыя «сарасоідамі» (г. зн., атрымальнікамі фінансавання па лініі Сораса і, па сутнасці, замежнымі агентамі), што негатыўна адбілася на грамадскім іміджы сектара ў абедзвюх краінах.

У Венгрыі як дзяржаўныя, так і прыватныя праўрадавыя СМІ клеймавалі праваабарончыя або назіральныя арганізацыі «палітычнымі» ці «замежнымі агентамі», якія спрабуюць дэстабілізаваць дэмакратычна абраны ўрад. Такога кшталту паведамленні ў СМІ найбольш часта фармулююцца непасрэдна высокапастаўленымі чыноўнікамі, якія жадаюць падвысіць свой аўтарытэт ў грамадскім дыскурсе. У 2014 годзе ў Азербайджане ўрад актыўна выступаў супраць мясцовых і міжнародных АГС. Праўрадавыя друкаваныя, тэлевізійныя і электронныя СМІ прадстаўлялі АГС як надзвычайна палітызаваныя, карумпаваныя, і пра-армянскія (прыніжальны ярлык, які выкарыстоўваецца для пазначэння ворага Азербайджана), якія дзейнічаюць з мэтай дэстабілізаваць Азербайджан, тым самым пазбаўляючы АГС якой-кольвек грамадскай падтрымкі.

У Кыргызстане расійскія СМІ актывізавалі сваю прысутнасць і разам з прарасійскімі мясцовымі СМІ ўздзейнічалі на прадэмакратычныя АГС каб схіліць грамадскую думку на карысць уваходжання Кыргызстана ў Мытны саюз. Напрыклад, газета «Дело №...» апублікавала некалькі артыкулаў, што ганьбілі рэпутацыю мясцовых праваабарончых арганізацый і іншых прадэмакратычных групаў.

У Македоніі і Чарнагорыі ўрад ціснуў на АГС, якія дазвалялі крытыку ў ягоны бок. У Чарнагорыі замест памяншэння грамадскага даверу да АГС, гэта падштурхнула да шырокай грамадскай падтрымкі абвінавачаных АГС і выклікала абурэнне грамадскасці дзейнасцю СМІ.

Між тым, такія негатыўныя тэндэнцыі прасочваюцца не паўсюль. Што цікава, у 2014 годзе восем краінаў паведамілі пра паляпшэнне грамадскага іміджу. Напрыклад, у 2014 годзе ў Арменіі негатыўнае стаўленне да АГС у СМІ не было ярка выяўлена, што з'яўляецца заўважнай зменай у параўнанні з папярэднімі гадамі. Цяпер СМІ больш зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з АГС, якія займаюцца пытаннямі, што закранаюць інтарэсы шырокай грамадскасці і спрыяюць сацыяльным зменам. Ва Украіне, у сувязі з пратэстамі на Еўрамайдане і актыўным удзелам журналістаў у грамадскай дзейнасці, СМІ цягам года пачалі больш асвятляць дзейнасць АГС, часта запрашаючы прадстаўнікоў АГС даць экспертныя каментары пра падзеі ў краіне. У Косаве АГС сталі надзвычай спрактыкаванымі ў прасоўванні сваёй пазнавальнасці і выкарыстанні СМІ для інфармавання грамадскасці, а таксама для фармавання грамадскага меркавання. У Грузіі грамадскасць цяпер усё больш інфармаваная пра АГС і іх дзейнасць, што вядзе да паляпшэння грамадскага іміджу сектара. У Латвіі, Літве і Славеніі АГС паведамляюць аб усё большым асвятленні іх дзейнасці на нацыянальным тэлебачанні, радыё, а таксама ў сацыяльных медыя.

## КРАЎДФАНДЫНГ І ВЁДРЫ ЛЕДЗЯНОЙ ВАДЫ

Амаль у кожнай краіне рэгіёну фінансавая жыццяздольнасць па-ранейшаму з'яўляецца найбольш складаным аспектам устойлівасці АГС. Значная частка сектара па-ранейшаму залежыць ад замежных донараў, якія ў многіх краінах усё больш скарачаюць свае бюджэты. Дзяржаўная падтрымка ў многіх краінах таксама важная. Разам з тым, АГС ужо даўно робяць спробы дыверсіфікаваць свае крыніцы фінансавання праз звароты да грамадскасці. Улічваючы эканамічны рост, які нарэшце набірае абароты ў большай частцы рэгіёну, АГС цяпер прыдумляюць новыя творчыя шляхі па зборы рэсурсаў сярод прыватных асобаў і прадпрыемстваў, якія зацікаўленыя ва ўмацаванні сувязі з АГС.

Краўдфандынг і іншыя электронныя механізмы становяцца ўсё больш папулярнымі сродкамі прыцягнення грамадскай падтрымкі, у прыватнасці, сярод АГС, занятых сацыяльнай, экалагічнай або культурнай дзейнасцю. Большасць справаздачаў з краінаў Паўночнага рэгіёна адзначаюць існаванне сайтаў па краўдфандынгу. Падобныя сайты цяпер таксама распрацоўваюцца ў такіх краінах, як Арменія, Беларусь і Расія. Напрыклад, у Арменіі некалькі арганізацый дыяспары ініцыявалі сайты па краўдфандынгу ў падтрымку армянскіх абшчынаў. У Расіі ў 2014 годзе праект «Нужна помощь.ру» сабраў каля 9 мільёнаў рублёў (прыкладна 237,500 долараў ЗША), у той час як «Благо.ру» збірае 1,5 мільёнаў рублёў (прыкладна 40,000 долараў ЗША) штомесяц. У Беларусі электронныя платформы для мясцовага збору сродкаў развіваюцца. Адна з іх – Social Weekend – прыцягнула каля 20,000 долараў ЗША, якія былі размеркаваныя паміж рознымі сацыяльнымі праектамі.

Ice Bucket Challenge (Айс бакет чэлендж - выпрабаванне вядром ледзяной вады), які ў 2014 годзе сабраў па ўсім свеце больш за 220 мільёнаў долараў ЗША для Асацыяцыі ALS (ALS Association), таксама дасягнуў Еўразіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Напрыклад, у Грузіі Ice Bucket Challenge выявіў яшчэ нерэалізаваны патэнцыял для правядзення дабрачынных кампаній. Нягледзячы на тое, што некаторыя з удзельнікаў выпрабавання ахвяравалі грошы Асацыяцыі ALS, многія вырашылі ахвяраваць грошы ў мясцовы дабрачынны фонд «Мы дапамагаем» (We Help), які сабраў больш за 100,000 долараў ЗША ахвяраванняў цягам усяго некалькіх тыдняў. У Эстоніі Ice Bucket Challenge, таксама як і некаторыя іншыя кампаніі па зборы сродкаў (такія як заплыў гумовых качак з мэтай збору сродкаў на будаўніцтва цэнтра для

дзяцей, хворых на рак), прыцягнуў людзей, якія раней ніколі не бралі ўдзел у сацыяльных праектах.

АГС рэгіёна таксама з'яўляюцца ініцыятарамі новых метадаў збору сродкаў. У Чэшскай рэспубліцы з'явіўся збор сродкаў па прынцыпе «роўны-роўнаму» (peer-to-peer fundraising), у якім падтрымка праекта або арганізацыі рэалізуецца з дапамогай асабістых рэкамендацый, у тым ліку праз сацыяльныя сеткі. Напрыканцы 2014 года ў Румыніі Фонд мясцовай супольнасці Бухарэста (Bucharest Community Foundation) зладзіў першы «Вялікі румынскі абед» (Romanian Big Lunch), у якім АГС ладзілі абеды каб сабраць сродкі і прыцягнуць новых прыхільнікаў да сваіх грамадскіх ініцыятываў. У Балгарыі семінар для грамадскіх ініцыятываў (Workshop for Civic Initiatives) прыцягнуў больш падтрымкі да сваіх донарскіх колаў – групаў людзей, якія перыядычна сустракаюцца для прыняцця рашэнняў па пытаннях ахвяраванняў на розныя патрэбы, у той час як новая сацыяльная сетка Yatoto.com збірае сродкі праз рэкламныя аб'явы і накіроўвае іх на розныя сацыяльныя патрэбы. У дадатак да ўсяго, на сёння ў Малдове існуе шэсць тэрміналаў ахвяраванняў – банкаматы, якія дазваляюць людзям ахвяраваць хутка і ананімна.

## ТЭНДЭНЦЫІ Ў ФАРМАВАННІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ

Агульны ўзровень устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі развіваўся ў 2014 годзе па розных накірунках, што вынікавалася ў прыблізна роўнай колькасці краінаў з пазітыўнымі і негатыўнымі тэндэнцыямі развіцця.

### ПАЎНОЧНЫ РЭГІЁН

Краіны Паўночнага рэгіёна (Балтыйскія і Вышаградскія) працягваюць хваліцца найвышэйшым агульным узроўнем устойлівасці ў Еўропе і Еўразіі. За выключэннем Венгрыі і Славеніі, усе краіны Паўночнага рэгіёна захоўваюць паказчыкі агульнай устойлівасці ў межах катэгорыі “Трывалая ўстойлівасць”. Узроўні ўстойлівасці АГС у Эстоніі і Польшчы з’яўляюцца найвышэйшымі у Еўропе і Еўразіі. Славенія працягвае мець найніжэйшы ўзровень устойлівасці сярод краінаў Паўночнага рэгіёна.




Застаючыся па-ранейшаму моцнай, устойлівасць АГС у Паўночным рэгіёне ў 2014 годзе крыху прыйшла ў застой ці нават пахіснулася. Венгрыя зарэгістравала пагаршэнне ва ўсіх параметрах устойлівасці з найбольш відавочнымі зменамі ў прававым асяродку. Пры не зусім зразумелых умовах дзейнасці і ў горшых прававых і фінансавых умовах АГС засяродзіліся на штодзённым выжыванні, а адсутнасць адкрытасці перад АГС з боку дзяржавы зрабіла іх адвакацыйныя намаганні марнымі. У Славакіі пагаршэнні былі адзначаныя ў прававым асяродку, фінансавай устойлівасці, адвакатаванні і інфраструктуры.

Разам з тым, без зменаў у агульных паказчыках устойлівасці, Славенія і Латвія адзначылі ў гэтым годзе рост па двух і болей параметрах устойлівасці. У Славеніі ў 2014 годзе палепшыліся адвакатаванне, грамадскі імідж і аказанне паслугаў. АГС часцей узгадваюцца ў нацыянальных штодзённых медыя ў якасці экспертаў з каментарамі альбо як суб'екты пазітыўных гісторый, а ўлады часцей прызнаюць вартасць АГС, якія прадастаўляюць паслугі, уключаючы іх у нацыянальныя стратэгіі і даючы ім права ўдзельнічаць у дзяржаўна-грамадскай палітыцы і выконваць паслугі. У Латвіі як вынік больш актыўнай і стратэгічнай дзейнасці рэгіянальных Цэнтраў падтрымкі НДА ў 2014 годзе палепшылася інфраструктура, а камунікацыйныя навыкі АГС палепшыліся праз павышэнне грамадскага іміджу сэктара.

## ПАЎДНЁВЫ РЭГІЁН

Усе дзевяць краінаў, якія лічацца часткай Паўднёвага рэгіёна (Паўднёва-заходняя Еўропа) захавалі агульныя паказчыкі ўстойлівасці ў катэгорыі "Устойлівасць развіваецца". Харватыя і Балгарыя, якія ўваходзяць у Еўрапейскі Звяз, маюць найвышэйшыя ўзроўні ўстойлівасці ў рэгіёне, а Сербія і Чарнагорыя – па-ранейшаму найніжэйшыя.




Косава і Албанія адзначылі ў 2014 годзе паляпшэнне агульных пакзчыкаў устойлівасці. У Косава стала магчыма зарэгістравацца ў інтэрнэце, павялічыліся сродкі ад цэнтральных і мясцовых установаў на прадастаўленне паслугаў, а таксама ўзмацняецца афіцыйнае супрацоўніцтва паміж АГС і вышэйшымі службовымі асобамі. У Албаніі АГС узмацнілі свой унутраны арганізацыйны патэнцыял, механізмы наладжвання сувязяў з грамадскасцю і адвакацыйную працу, а дзяржава часцей прызнае ўнёсак АГС у асноўныя нацыянальныя рэформы і працэс прыняцця рашэнняў. Хоць агульны паказчык устойлівасці не змяніўся, прававы асяродак АГС, адвакацыйны патэнцыял і імідж сектара АГС у Македоніі ў 2014 годзе пагоршыліся.

## ЕЎРАЗІЯ

Разыходжанне ва ўстойлівасці АГС у рэгіёне было асабліва відавочна ў Еўразіі, дзе ў дзвюх краінах – Азербайджане і Расіі – устойлівасць АГС пагоршылася, а ў дзвюх – Малдове і Украіне – палепшылася.

Як у Азербайждане, так і ў Расіі ўрады прынялі захады, каб абмежаваць поле грамадскай дзейнасці, што адбілася на некалькіх параметрах устойлівасці. У Азербайджане агульная ўстойлівасць рэзка знізілася, пагоршыліся ўсе параметры, акрамя аказання паслугаў. Некаторыя абмежаванні праз папраўкі ў законы пра грамадзянскую супольнасць значна скарацілі поле дзейнасці АГС. Дадаткова, узмацніліся абмежаванні замежнага фінансавання, якія значна паменьшылі аперацыйныя бюджэты, што паўплывала на чалавечыя рэсурсы і на дзейнасць АГС

па забеспячэнні грамадскай празрыстасці. І нарэшце, хваля рэпрэсій у дачыненні да лідэраў АГС мінімізавала колькасць і якасць адвакацыйных намаганняў. У Расіі ўзмоцнены дзяржаўны кантроль над медыя, больш актыўнае ўжыванне нацыяналістычнай рыторыкі і працяглыя намаганні дзяржавы паўплываць на ўсю арганізаваную актыўнасць у публічнай сферы альбо абмежаваць яе фактычна стварылі асяродак, варожы для развіцця АГС.




Нягледзячы на бурлівы год ва Украіне, агульная ўстойлівасць АГС – уключаючы арганізацыйны патэнцыял, фінансавую устойлівасць, адвакацыйныя кампаніі, аказанне паслугаў і успрыманне АГС грамадскасцю – у 2014 годзе палепшыліся. Дзякуючы падзеям на Еўрамайдане, таксама вядомым як “Рэвалюцыя годнасці”, грамадзянская супольнасць успрымаецца зараз грамадскасцю, дзяржавай і палітыкамі як уплывовы гулец у сітуацыі ў краіне. У Малдове палепшыліся ўсе параметры ўстойлівасці, апроч грамадскага іміджу. У Арменіі і Беларусі таксама адбыліся невялікія паляпшэнні па шматлікіх параметрах устойлівасці, хоць гэта не змяніла агульныя паказчыкі устойлівасці. У Беларусі ўзмацніліся арганізацыйны патэнцыял і грамадскі імідж, а ў Арменіі трошкі палепшыліся арганізацыйны патэнцыял, адвакатаванне, інфраструктура і грамадскі імідж.

З улікам самых нядаўніх пагаршэнняў, Азербайджан у 2014 годзе далучыўся да Беларусі ў катэгорыі “Ускладненая ўстойлівасць”. Астатнія краіны ў Еўразіі ўсе застаюцца ў катэгорыі “Устойлівасць развіваецца”. Украіна працягвае мець найвышэйшы ўзровень устойлівасці ў рэгіёне, набліжаючыся да катэгорыі “Трывалая ўстойлівасць”, а Беларусь – найніжэйшы ўзровень, займаючы пазіцыю ў сярэдзіне катэгорыі “Ускладненая ўстойлівасць”.

## ЦЭНТРАЛЬНАЯ АЗІЯ

АГС Цэнтральнай Азіі працягваюць змагацца з найніжэйшымі ўзроўнямі ўстойлівасці ва ўсёй Еўропе і Еўразіі. Казахстан і Кыргызстан застаюцца ў сярэдзіне катэгорыі “Устойлівасць развіваецца”, у самым нізе якой месціцца Таджыкістан. Хоць балы па Ўзбекістане і Туркменістане ў гэтым годзе не пазначаныя, АГС ў гэтых краінах працягваюць дзейнічаць з абмежаваным патэнцыялам у вельмі неспрыяльным асяродку. Агульная ўстойлівасць АГС пагоршылася ў 2014 годзе ў Кыргызстане. Адміністратыўныя перашкоды папсавалі прававы асяродак, арганізацыйны патэнцыял саслабеў, а атакі прарасійскіх СМІ на праваабарончыя арганізацыі і іншыя прадэмакратычныя АГС моцна пагоршылі грамадскі імідж АГС. У той жа час спробы парламентароў і чыноўнікаў націснуць на сектар АГС дапамаглі АГС мабілізавацца і дамагчыся пэўных поспехаў у адвакатаванні.




Грамадзянская супольнасць Туркменістана застаецца ў надзвычай абмежаваных умовах. Новых АГС цягам года не было зарэгістравана, іх агульная колькасць налічвае ўсяго 106 арганізацый, дзве траціны з якіх цесна звязаныя з урадам. Праўрадавыя АГС звычайна з'яўляюцца найбольш фінансава ўстойлівымі, у той час як большасці іншых АГС не хапае сродкаў, і яны не ў стане ўтрымліваць персанал, якому трэба плаціць, альбо абвучыць штат.

Ва Узбекістане шэраг пытанняў, у тым ліку дзяржаўныя абмежаванні ў доступе да замежнага фінансавання і скепсіс наконт актыўных і незалежных арганізацый, перашкаджаюць далейшаму развіццю ўстойлівасці сектара. Тым не менш, шэраг прававых, палітычных і канстытуцыйных зменаў, прынятых у 2014 годзе, маюць патэнцыял павялічыць ролю, якую грамадзянская супольнасць грае ва ўзбекскім грамадстве, а таксама ўзмацніць яе разнастайнасць і ўстойлівасць.



*Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГСІУ) з'яўляецца ключавым інструментам вымярэння прагрэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі (E&E рэгіён). Індэкс адсочвае прагрэс грамадскага сектара ў дваццаці дзевяці краінах цягам апошніх васямнаццаці год. Індэкс вывучае агулам варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, з фокусам на прававы асяродак для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнае развіццё, фінансавую ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктуру і грамадскі імідж. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.*

*Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне "АКТ", actngo.info@gmail.com*

*Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці 2014 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная для азнаямлення па спасылцы: http://www.usaid.gov/europeeurasia-civil-society*